УДК 808.26-07

Т.М.Федарцова, выкладчык кафедры
беларускай мовы

# ШЛЯХІ І МЕТАДЫ АДАПТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ 1-ГА КУРСА ПРАЗ ФАРМІРАВАННЕ ІХ СВЕТАПОГЛЯДУ, МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНАГА І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА АБЛІЧЧА СРОДКАМІ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЯЎ

The article analyses ways and methods of first-year student adaptation by moulding their world outlook and intellect by means of intersubject links. It shows the employment of educational interaction methods at higher schools.

Гуманітарызацыя інжынерна-тэхнічнай адукацыі ва універсітэце ставіць перад выкладчыкамі-моваведамі і літаратуразнаўцамі больш шырокія задачы, чым прафесійнае навучанне свайму прадмету будучай тэхнакратычнай інтэлігенцыі. Іх абавязак ужо на першым курсе дапамагчы ўчарашнім школьнікам навучыцца самастойна аналізаваць і ацэньваць як прафесійна-вытворчыя абставіны, так і грамадскія падзеі, зрабіць першыя спробы пастаноўкі праблемы, пошуку шляхоў яе вырашэння, аргументацыі сваіх доказаў і вывадаў, навучыць дэмакратычна і гуманна вырашаць самыя складаныя грамадскія, сацыяльная і міжіндывідуальныя супярэчнасці.

Эфектыўна выканаць пастаўленыя задачы немагчыма, калі не звяртацца да псіхалогіі, філасофіі, гісторыі, літаратуры.

Ужо на першых азнаямленчых занятках студэнтам даводзіцца адрозненне паміж індывідам, індывідуальнасцю і асобай. Робіцца акцэнт на тое, што чалавек выяўляе сваю існасць у залежнасці ад грамадскіх адносінаў, якія ўтвараюць той свет, у якім ён жыве і дзейнічае. І тут не абысціся без ведаў філасофіі, бо студэнтаў цікавяць пытанні часовага і вечнага, дабра і зла, прыгажосці і пачварства і г.д.

З мэтай наладжвання міжіндывідуальных адносін у студэнцкім калектыве, пошуку эфектыўных метадаў навучання і кантролю за якасцю ведаў студэнтаў выкладчык абапіраецца на псіхалогію і педагогіку. Дарэчы, галоўны акцэнт у выхаваўчай рабоце робіцца на патрэбу навучыць моладзь жыць гарманічна, развіваючы душу і розум, прывіваючы імкненне разумець іх ролю як асобы ў навакольным свеце (з дапамогай гісторыі і літаратуры).

Малады чалавек прыйшоў у ВНУ. Новыя абставіны, адсутнасць звыклага школьнага рэжыму, змена бытавых умоў ды і змена статусу самой асобы — усё гэта пэўным чынам уплывае на псіхалагічны стан першакурсніка, выклікае ў яго разгубленасць перад самастойным жыццём,

няўпэўненасць у сваіх сілах, а першыя цяжкасці нават параджаюць сумненні ў правільнасці выбару прафесіі. Таму праца з першакурснікамі патрабуе ад выкладчыкаў гуманітарных навук чуйнага разумення тых эмацыянальных зрухаў у душах сваіх падапечных, што выкліканы нязвыкласцю студэнцкага жыцця. Абавязковая дапамога ў адаптацыі першакурснікаў да новых умоў таксама патрабуе ад выкладчыка комплексных ведаў па сацыяльнай псіхалогіі, логіцы, педагогіцы.

Выкладчыкі імкнуцца зняць пачуццё няўпэўненасці і разгубленасці перад нязвыклай сістэмай кантролю ведаў у ВНУ, спакваля падвесці да першых навуковых пошукаў, выкарыстоўваючы напісанне рэфератыўных прац, накіраваных на выхаванне эстэтычных і культурна-асветніцкіх патрэб асобы.

Усе гэтыя патрабаванні цесна пераплятаюцца з задачай прафесійнага плана — выхаваннем маўленчай асобы.

Для дасягнення большай эфектыўнасці ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце выкарыстоўваюцца шматлікія прынцыпы. Але найбольш успрымальнымі з іх для першакурснікаў з'яўляюцца:

а) навучанне як радасць адкрыцця; б) навучанне-творчасць. Бо яны

не толькі дапамагаюць перадаць сутнасць прадмета, які вывучаюць (у дадзеным выпадку — беларускай мовы) праз навейшыя дасягненні сённяшняга дня ў цеснай сувязі з варункамі мінулага, але ў цэнтр усёй педагагічнай дзейнасці ставяць асобу навучэнца.

Неацэнную дапамогу ў актывізацыі гуманітарнай адукацыі ў тэхнічнай ВНУ аказвае пастаянна дзеючы семінар па выкарыстанні інтэрактыўных метадаў педагагічнага і метадычнага ўзаемадзеяння ў ВНУ, які працуе пры кафедры беларускай мовы. Ён дапамагае ўвязаць у непарыўную еднасць асветніцкія, навучальныя і выхаваўчыя функцыі. Таму маўленчая практыка студэнтаў, раздатачны матэрыял, рэфератыўныя працы — усё скіравана на развіццё творчага патэнцыялу першакурсніка, яго эстэтычнага густу, культуры мыслення і маўлення.

Выхаваўчыя і асветніцкія функцыі не абмяжоўваюцца заняткамі. Дзейнасць студэнтаў асабліва праяўляецца падчас правядзення розных мерапрыемстваў. Гэта культпаходы ў тэатры і на выставы, сустрэчы з цікавымі людзьмі, творчай інтэлігенцыяй сталіцы. Кожную значную падзею абавязкова абмяркоўваем у групе.

Інтэрактыўныя метады педагагічнага і метадычнага ўзаемадзеяння ў ВНУ падказваюць мноства разнастайных творчых падыходаў да працы ў студэнцкай групе. Нават праца па падгрупах тут будуецца зусім паіншаму; бо падзел адбываецца не па абязлічанай колькасці студэнтаў, а менавіта па ўліку іх псіхалагічных асаблівасцей.

Як правіла, групы не аднародныя па стылю дзейнасці саміх студэнтаў. У асноўным псіхолагі вызначаюць чатыры разнастайнасці тыпаў асоб па дзейнасці. Сапраўды, адны студэнты схільны да сур'ёзнага аналізу, сінтэзу, пошуку узаемасувязяў. Гэта так званыя мысліўцы-тэарэтыкі. Яны пад любое пытанне імкнуцца падвесці тэарэтычнае абгрунтаванне.

Другія — назіральнікі. Ім абавязкова патрэбен час на роздум. Яны не пачынаюць працу, пакуль не зададуць дадатковыя пытанні, не вызначаць для сябе, што яны на верным шляху.

Трэція асобы — рэфлексіўныя. У іх усё базуецца на пачуццях. Менавіта яны прыносяць у выкананне задання нешта сваё, адметнае. Гэта вельмі адчувальныя людзі, бо прапускаюць усе падзеі праз сэрца.

І чацвёрты тып асобаў — практыкі. Гэта людзі, якія выдатна могуць справіцца з заданнем толькі пасля таго, як убачаць узор яго выканання. Тэарэтычная частка ў іх заўсёды на апошнім плане.

Вызначыць, да якога тыпу адносіцца асоба, вельмі проста. Быць уважлівым да студэнтаў на занятках, аналізаваць іх дзеянні і ўчынкі. На кожную студэнцкую групу можна скласці невялікую схемку, размеркаваўшы чатыры калонкі пад назвамі:

Пачуццё / Назіранні / Думкі / Практычная дзейнасць /

---

У гэтыя калонкі ўносяцца прозвішчы студэнтаў. І калі пры выкананні пэўнага задання студэнцкая група падзяляецца на некалькі падгрупаў, то ў кожную з іх уключаюцца вышэйпералічаныя тыпы асоб, адметных па сваіх псіхалагічных схільнасцях характару.

Такія падгрупкі схільны хутка і эфектыўна выконваць творчыя заданні. У адпаведнасці з характарам задання, мяняецца і лідэрства ўдзельнікаў падгрупы. Цікава, што калі на галоўную ролю выходзяць рэфлексіўныя асобы, то нараджаюцца нават вершаваныя адказы ці пытанні, скажам, віктарыны. Так, пры праходжанні правапісу слоў са спалучэннямі -ро, -ло, якія не пад націскам пераходзяць у -ры, -лы, падгрупа, якую узначальвала студэнтка 8 гр. факультэта ХТіТ Алёна Шэшка, прывяла такія прыклады: (дровы — дрывасек) "Жыў у лесе дрывасек, кожны дзень ён дровы сек", (брод — брысці) "О мой народ, брысці табе не год, калі не ведаеш, дзе ў гэтай плыні брод", (гром — грымець) "Такі разгром наладзіў гром. І гэта ж трэба так умець — заядла попусту грымець".

А студэнты 4- й групы факультэта ТТЛП Ненарокамаў Канстанцін і Паскробка Мікалай пры замацаванні тэмы "Лічэбнік" прапанавалі групе такое вершаванае пытанне:

— То маю род, а то не маю, І лік у сакрэце я трымаю, Я самастойны, не нахлебнік У мове я завусь ... (лічэбнік). Вядома, група падхоплівае:

"Лічэбнік!" А далей яны звяртаюцца да групы з пытаннем: — Ці ўсе лічэбнікі маюць род і лік?

Няцяжка здагадацца, што да творчага выканання задання часцей схільныя мысліўцы і рэфлексіўныя асобы. Назіральнікі і практыкі гэтымі якасцямі вызначаюцца значна радзей.

Для ўсталявання творчага працэсу навучання вельмі важна стварэнне адносін добразычлівасці і ўзаемапавагі паміж студэнтамі і выкладчыкам. Амерыканскі псіхолаг Колб лічыць, што чалавек, які вучыцца, мае права на памылку. Роля выкладчыка своечасова заўважыць яе і (пажадана разам з групай) выправіць. Пры гэтым варта падбадзёрыць чалавека, даць яму адчуць упэўненасць у сабе. І зноў жа ў поўным аб'ёме можна скарыстаць інтэрактыўныя метады навучання. Бо мысліўцы любяць, калі ім дазваляюць самастойна папрацаваць над памылкамі. Назіральнікам трэба даць час усвядоміць свае хібы, рэфлексіўных — супакоіць, паказаўшы, што такія памылкі тыповыя ў студэнцкім асяроддзі, а з практыкамі трэба яшчэ да ўсяго замацаваць дадзены матэрыял індывідуальна.

Часта пры выкананні заданняў па выхаванню маўленчай асобы выкладчык правакуе дыскусіі паміж падгрупамі. Бо менавіта дыскусіі развіваюць крытычнае мысленне. Дыскусіі могуць узнікаць стыхійна. І тут важна скіраваць іх у вызначанае рэчышча. Бо ў студэнтаў часта бывае вялікая спакуса адысціся ад зададзенай тэмы. Таму выкладчык павінен увесь час кантраляваць групу, звяртаць увагу, хто падчас выканання задання дамінуе ў групавой працы, і імкнуцца да таго, каб усе ўдзельнікі ацэньваліся аднолькава справядліва. Для гэтага трэба абавязкова даць падгрупам час для параўнання вынікаў працы.

Сутнасць працы ў падгрупах можа быць парушаная, калі ўвесь час будзе падтрымлівацца падзел групы на адны і тыя ж калектывы студэнтаў. Таму ўдзельнікі падгруп мяняюцца, бо групавая праца — гэта не сістэма заахвочвання выдатных студэнтаў, але і не сістэма для падцягвання слабых. Гэта адзін з метадаў працы, які робіць лягчэйшым сумеснае навучанне ўсіх тыпаў асоб у студэнцкай групе.

Інтэрактыўныя метады навучання ўлічваюць псіхалагічныя моманты ў повязі гуманітарных навук са спецыяльнымі. Бо найгалоўнейшая мэта ВНУ — прывіццё студэнту любві і павагі да сваёй будучай прафесіі. Таму мы імкнёмся ўвязаць канкрэтныя заданні з пэўнай тэрміналогіяй, тлумачым прафесіяналізмы. Для кожнай групы складаюцца заданні з улікам таго, каб, акрамя замацавання ведаў па беларускай мове, яны неслі ў сабе пэўную інфарматыўнасць, пазнавальнасць і эстэтызм.

Заўважана: студэнтамі добра ўспрымаюцца заданні, непасрэдна звязаныя з будучай прафесіяй, таму часта для іх падрыхтоўкі карыстаемся не толькі літаратурнымі творамі, але і спецыялізаванай літаратурай. Напрык-

лад, для студэнтаў ТТЛП, ЛГФ рыхтуюцца тэксты па "Даведніку майстра лесанарыхтовак" (Матвейка А.П., Федарэнчык А.С., Завойскіх Г.І.), "Лясная піралогія з асновамі радыеэкалогіі" (Рыхтэр І.Э.), "Экалогія з асновамі метэаралогіі" (Ражкоў Л.М.); для студэнтаў хімічных факультэтаў скарыстоўваюцца тэксты з вучэбнага дапаможніка "Асновы агульнай хіміі" (Новікаў Г.І., Жарскі І.М.).

Так, скарыстоўваючы комплекс інавацыйных метадаў, з дапамогай цэлага шэрагу дадатковых дысцыплін (псіхалогіі, логікі, педагогікі, філасофіі, літаратуры да таго і спецыяльных) праз родную мову выхоўваецца высокаінтэлектуальная маўленчая асоба.

УДК 808.26-07

Н.Я.Савіцкая, старшы выкладчык
кафедры беларускай мовы

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПСІХАЛАГІЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ СТУДЭНЦКАГА ЎЗРОСТУ ДА АКТЫВІЗАЦЫІ АДАПТАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

The article dwells upon the psychological peculiarities of students. The knowledge of these peculiarities will help to get students adapted to their studies at a higher educational institution, to diminish cases of their expelling and to give them an adeguate guidance in education.

К.Дз.Ушынскі лічыць узрост ад 18 да 25 гадоў самым вырашальным для чалавечага лёсу, гэта лёсаносны перыяд у жыцці чалавека. Ён мае свае характэрныя асаблівасці. Студэнцтва — спецыфічная сацыяльная група, якая характарызуецца пэўнымі умовамі пражывання, мае цэласныя арыентацыі. Кажуць, што па ўзроўні студэнцтва можна меркаваць аб развіцці краіны.

Сярод асаблівасцей можна вылучыць натуральныя і сацыяльныя фактары, якія характарызуюць гэты ўзрост. Да натуральных можам аднесці якасці, звязаныя з прыродным развіццём.

Да сацыяльных асаблівасцей студэнцкага ўзросту можам аднесці наступныя: залежнае становішча — ад дапамогі сям'і, ад стыпендыі; частую прысутнасць тэндэнцыі спажывальніка (не прывучаны клапаціцца аб іншых, інфантылізм, які датычыць абавязкаў); нізкую сталасць асобы; грамадска-палітычную актыўнасць (патрэбнасць у грамадска-палітычных зносінах).

Сярод студэнтаў шмат акцэнтуяваных асоб. У 1976 г. псіхолаг Рожэнец вывучыў асаблівасці адлічаных студэнтаў. Гэтае даследаванне ён правёў на базе Ленінскага р-на г. Масквы, карыстаючыся методыкай Леангарда. Ён падзяліў усіх адлічаных студэнтаў на тры групы: 1) акцэнтуяваныя